Аналіз работы кабінета беларускай мовы і літаратуры
за 2023/ 2024 навучальны год

У мінулым навучальным годзе работа кабінета беларускай мовы і літаратуры была накіравана на вырашэнне наступных задач:

1. Садзейнічанне ўзаемазвязанай дзейнасці настаўнікаў і вучняў на ўроках, пазакласных і пазаўрочных занятках;
2. Арганізацыя работы па аснашчэнні кабінета абсталяваннем, якое дапамагае арганізацыі працы настаўнікаў і вучняў і забяспечвае высокі ўзровень выкладання;
3. Стварэнне аптымальных умоў для навучання і выхавання дзяцей.

Кабінет беларускай мовы і літаратуры адпавядае санітарна-гігіенічным патрабаванням: асвятленне кабінета добрае, выконваецца паветрана-цеплавы рэжым, абсталяванне ў кабінеце размешчана ў адпаведнасці з нормамі. Усё гэта спрыяе эфектыўнасці правядзення ўрокаў, павышэнню якасці ведаў вучняў.

У добрым стане знаходзіцца мэбля: вучнёўскія сталы і крэслы, дошка, стол настаўніка. Памяшканне светлае, утульнае, што стварае спрыяльны клімат для працы настаўніка і вучняў.

У мэтах умацавання і папаўнення матэрыяльнай базы кабінета набыты наступная навукова-метадычная літаратура: матэрыялы для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання па арфаграфіі, лексікалогіі, фанетыцы, акцэнталогіі, арфаэпіі, графіцы, фразеалогіі і парэміялогіі; тэставыя заданні па беларускай літаратуры 5, 6, 7, 8, 9, 10, 11 класы; кантроль ведаў па беларускай літаратуры (літаратурныя дыктанты) 9, 10, 11 класы; правілы беларускай арфаграфіі; беларуская мова (тэсты); тэсты па беларускай мове для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціраваня; усе віды лінгвістычных разбораў; кніга па падрыхтоўцы да алімпіяды. Набыты дыскі: падрыхтоўка да цэнтралізаванага тэсціравання; распрацоўкі ўрокаў па Я.Коласу і Я.Купалу; святы ў школе. Сумесна з вучнямі былі падрыхтаваны тэсты для правядзення прамежкавага і выніковага кантролю ў 5-9 класах.

У мэтах задавальнення запытаў і пашырэння інтарэсаў школьнікаў да прадмета на базе кабінета на працягу навучальнага года праводзілася пазакласная работа. З вучнямі былі арганізаваны індывідуальныя, групавыя, масавыя формы пазакласнай дзейнасці. Сярод індывідуальных форм работы шырока выкарыстоўваліся: пазакласныя чытанні, падрыхтоўка дакладаў, рэфератаў. Сярод групавых форм – падрыхтоўка і правядзенне Дня беларускай пісьменнасці, тыдня беларускай мовы і літаратуры, кніжныя выставы, тэматычныя стэнды. Праводзіліся масавыя мерапрыемствы з вучнямі па мове і літаратуры: “Родная мова – цікавая мова”, “Беларуская скарбонка”, “Урок-падарожжа па станцыях беларускай мовы”, “Беларуская мова – сродак зносін”,

гульня-спаборніцтва да Дня беларускага пісьменства, мерапрыемствы да юбілеяў беларускіх пісьменнікаў.

На працягу года у кабінеце беларускай мовы і літаратуры былі праведзены выставы творчых работ вучняў (сачыненняў, рэфератаў). Вялася работа па абнаўленню матэрыялаў, размешчаных у класным вугалку.

У кабінеце было арганізавана дзяжурства вучняў згодна графіка, распрацавана памятка для дзяжурных.

Разам з тым у рабоце кабінета беларускай мовы і літаратуры маецца рад нявыкарыстаных рэзерваў і магчымасцей. У бягучым навучальным годзе неабходна прадоўжыць работу па камплектаванні кабінета вучэбным абсталяваннем. Больш увагі неабходна надаваць стварэнню ўмоў для максімальнага задавальнення запытаў вучняў з улікам яго індывідуальных здольнасцей і магчымасцей.

Задачы на 2024 /2025 навучальны год:

1. Арганізацыя ўзаемнай дзейнасці настаўніка і вучняў на ўроках, пазакласных мерапрыемствах, факультатыўных занятках;
2. Папаўненне матэрыяльнай базы кабінета новымі дыдактычнымі сродкамі навучання, арфаграфічнымі слоўнікамі і даведнікамі.